# Прэзентавалі унікальную кнігу

**Факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля, самага старажытнага помніка кніжнай культуры, створанага на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, прэзентавалі ў Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Карскага.**



"Тураўскае Евангелле – гэта не проста 10 старонак гісторыі, рукапісу, але 10 старонак сведчання пра тую глыбокую і старажытную культуру, да якой мы, беларусы, належым. І гэта вялікі цуд, што ў 1865 годзе Тураўскае Евангелле было знойдзена ў звычайнай скрыні з-пад вугалю, і яшчэ большы цуд – тое, што дзякуючы сучасным тэхналогіям мы можам убачыць якаснае выданне, усю прыгажосць выканання рукапісу і сам подзвіг таго, хто яго пісаў", – адзначыў кіраўнік выдавецкага аддзела Гродзенскай праваслаўнай епархіі іерэй Антоній Семілет.

Тураўскае Евангелле – самы старажытны помнік кніжнай культуры на тэрыторыі Беларусі, а таксама ва ўсходнеславянскім і ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Створаны ён быў у XI ст. у Тураўскім манастыры, які на працягу некалькіх стагоддзяў разам з Полацкім быў цэнтрам перапісу кніг. Рукапіс быў знойдзены ў 1865 годзе ў Тураве двума ўдзельнікамі археалагічнай экспедыцыі. З тых часоў знойдзеныя 10 старонак Евангелля захоўваюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе. У Рэспубліцы Беларусь факсімільныя копіі надрукаваны па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сумесна з кампаніяй "Xerox" тыражом 500 экзэмпляраў з выкарыстаннем навейшых тэхналогій. Гэта выданне атрымала перамогу ў намінацыі "Духоўнасць" у 54-м нацыянальным конкурсе "Мастацтва кнігі". У межах праекта ў 2012 годзе быў выдадзены віленскі «Буквар» 1767 года, самы ранні з беларускіх буквароў, які захаваўся. Праграма будзе працягвацца факсімільным перавыданнем іншых помнікаў кніжнай культуры. Так, да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое будзе адзначацца ў 2017 годзе, запланавана выданне поўнага збору кніг Францыска Скарыны. Першыя пяць тамоў збору ўжо выдадзены, на чарзе яшчэ шэсць.

У бліжэйшыя дні распачнецца камерцыйная фаза праекту. Факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля паступіць ў свабодны продаж. Падчас прэзентацыі намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр Суша перадаў унікальнае выданне бібліятэкам і музеям рэгіёна.

***Вольга Кацько***
***Фота аўтара***